# ГЛАБАЛІЗАЦЫЯ ЯК САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ПРАБЛЕМА

***В. М. Белакурскі,*** *кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Ідэі аб чалавецтве як адзіным арганізме выказваліся яшчэ ў Старажытнай Індыі («Бхагавад-гіта»). Іх далейшае развіццё цесна звязана з уяўленнямі мысляроў аб ідэальных дзяржаве і грамадстве (Платон, Т. Кампанэла, Ф. Бэкан, Т. Мор і інш.).

Феномен глабалізацыі ў цяперашнім выглядзе пачаў афармляцца пасля Другой сусветнай вайны (1939–1945). Ён атрымаў сваё ўвасабленне ў юрыдычным замацаванні Ялцінскімі, а таксама Патсдамскімі пагадненнямі блокавай сістэмы свету, падзеленай на два лагеры – сацыялістычны і капіталістычны.

Глабалізацыйныя працэсы аказаліся ў цэнтры ўвагі заходніх даследчыкаў (Т. Левіт, Дж. Маклін, Р. Робертсан і інш.) у 80-я гг. XX ст. На сённяшні дзень іх асэнсаванне прадстаўлена галоўным чынам парадыгмай мадэрнізацы. Згодна з ёй, глабалізацыя выступае новай фазай шырокага працэсу, які ахоплівае ўсё чалавецтва цалкам (У. Бэк, Д. Бэл, Э. Гідэнс, Дж. Гэлбрэйт, М. Кастэльс, Т. Парсанс, К. Попер, У. Растоу, Р. Робертсан, Ф. Фукуяма і інш.). Сярод навукоўцаў усё яшчэ няма адзінства адносна таго, які з аспектаў глабалізацыі лічыць вызначальным. На думку М. Кастэльса, галоўным выступае фарміраванне інфармацыйнага грамадства і глабальнай эканомікі. «Менавіта сацыяльныя сеткі, – падкрэслівае М. Кастэльс, – складаюць новую сацыяльную марфалогію нашага грамадства, а распаўсюджванне «сеткавай» логікі ў значнай меры адбіваецца на выніках працэсаў, звязаных з вытворчасцю, паўсядзённым жыццём, культурай і ўладай» [1, 494]. Згодна з Э. Гідэнсам, гэта, перш-наперш, размежаванне ў жыцці грамадства часу і прасторы. У канцэпцыі Р. Робертсана



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сцвярджаецца, што глабалізацыя выклікана фундаментальнымі зменамі ў культуры, што прывяло да асэнсавання свету як цэлага. Таму глабальная свядомасць індывідаў мае найважнейшае значэнне ў ператварэнні свету ў «адзінае сацыякультурнае месца».

Прадстаўнікі так званага інфармацыйнага грамадства складаюць сёння раскіданы па ўсім свеце квазіэтнас з пэўным стэрэатыпам паводзін, у якіх заяўляе аб сабе касмапалітычная асоба. Гэтыя індывіды падзяляюць аднолькавыя культурна-палітычныя каштоўнасці (свабодны рынак, адкрытае грамадства, «свет без межаў», ліберальна-дэмакратычныя ідэалы, еўра-амерыканскія ўзоры культуры і інш.), валодаюць адносна высокім узроўнем адукацыі, адпаведным матэрыяльным даходам, пастаянна даступнай сеткай Інтэрнэт, а іх «другой роднай» мовай з'яўляецца амерыканізаваны варыянт англійскай. Свой дабрабыт і дастатак яны маніфестуюць як блізкае і цудоўнае будучае для ўсіх жыхароў нашай планеты. Разам з тым сённяшняя рэчаіснасць выглядае не зусім аптымістычна. Так, паводле Клауса Шваба, прэзідэнта Сусветнага эканамічнага форуму ў Давосе, менавіта на мяжы новага тысячагоддзя пачалася чацвёртая прамысловая рэвалюцыя, якая стварае свет, дзе віртуальныя і фізічныя сістэмы вытворчасці гнутка ўзаемадзейнічаюць паміж сабой на глабальным узроўні. Узнікаюць прынцыпова новыя магчымасці для навуковых прарываў у генетыцы, нанатэхналогіях, квантавым вылічэнні, аднаўленні энергарэсурсаў. «Небяспека заключаецца ў тым, што чацвёртая прамысловая рэвалюцыя робіць прынцып «пераможца атрымлівае ўсё» дамінуючым у адносінах паміж краінамі, а таксама ўнутры іх. Гэта павялічвае сацыяльную напружанасць і канфлікты, абумоўлівае стварэнне менш узаемазвязанага і больш нестабільнага свету, асабліва з улікам таго, што сёння людзі значна лепей інфармаваны аб сацыяльнай несправядлівасці і неадпаведных умовах жыцця ў розных краінах» [3, с. 40].

Становіцца відавочным, што глабалізацыя эканомікі вядзе да маргіналізацыі пераважнай часткі насельніцтва на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Захадзе і Усходзе. Эканамічная маргіналізацыя, у сваю чаргу, цягне за сабой палітычную маргіналізацыю грамадства, паколькі найважнейшыя рашэнні ў глабальнай палітыцы прымае зусім не электарат. Як слушна заўважае М. Кастэльс, працэс глабалізацыі сёння разглядаецца ў паняццях «сетак», а не «плошчаў», паколькі ўнутраная і знешняя палітыка дзяржаў прадстае ўсё больш залежнай ад міжнародных наднацыянальных структур і інстытутаў.

Пагражаючым наступствам глабалізацыі з'яўляецца пераструктураванне этнакультурных ідэнтычнасцей. Глабалізацыя садзейнічае актыўнаму размыванню «ядра» культуры, яе імператываў і каштоўнасцей, ствараючы гамагенны рацыяналізаваны і прагматызаваны кантэкст, пазбаўлены духоўна-сакральнага вымярэння, што правакуе сёння розныя пратэстныя рухі, у тым ліку радыкальныя (краіны Блізкага Усходу, Паўночнай Афрыкі і інш.). Адзначанае вышэй сведчыць таксама аб тым, што нацыянальныя культуры паслабілі выкананне сваёй «антыэнтрапійнай» ролі, усё цяжэй знаходзячы формы адэкватнага адказу на цывілізацыйна-глабалісцкія выклікі сучаснасці. Таму ў цяперашні час надзвычай актуалізуецца праблема захавання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці. Людзі і нацыі імкнуцца даць свой адказ на самае галоўнае пытанне з тых, што стаяць перад чалавекам: «Хто мы?» [4, с. 35].

Асэнсаванне і крытыка дэструктыўных з'яў глабалізацыі выклікалі да жыцця ў навуковым асяроддзі новае паняцце – «глакалізацыя». Дадзены тэрмін увёў у 1980-я гг. А. Марыта – прэзідэнт японскай карпарацыі «Soni». Пазней брытанскі сацыёлаг Р. Робертсан надаў яму больш глыбокі змест, імкнучыся даказаць, што глабальны і лакальны сацыякультурныя працэсы не адмаўляюць адзін аднаго, хаця ў асобных выпадках паміж імі і ўзнікае супрацьстаянне. Глакалізацыя, згодна з думкамі навукоўца, уяўляе сабой «сусветную культурную прастору, у якой адбываецца ўзаемадзеянне і ўзаемапранікненне лакальных культур як культурна-гістарычных утварэнняў са сваёй ментальнасцю, здольных да захавння сваёй ідэнтычнасці ва ўмовах гла-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

балізацыі» [2, с. 177]. У дадзеным кантэксце паняцце «глакалізацыя» прэтэндуе на тое, каб адпавядаць сцэнарыю «дэцэнтралізаванага справядлівага Сусвету». На думку аўтара, яна даволі добра адлюстроўвае актывізацыю лакальных этнічных культур, рост іх уплыву на ідэнтычнасць. Апошнія ў выніку сутыкнення з глабальнай культурай павінны набыць новыя вымярэнні і больш багаты змест.

Развіццё такіх ўяўленняў, на наш погляд, выступае своеасаблівым апраўданнем глабалізацыі, у тым ліку яе негатыўных наступстваў. Глабалізацыя па-ранейшаму нясе сур'ёзныя пагрозы, рызыкі і страты, ставячы пытальнік адносна самабытнасці нацыянальных культур, якія могуць быць раствораны ў патоку культурнай уніфікацыі.

Сучасная глабалізацыя – гэта інтэрнацыяналізацыя эканамічнага, палітычнага і культурнага жыцця чалавецтва, арыентаванага на фарсіраванне эканамічнай інтэграцыі з максімальным выкарыстаннем навукова-тэхнічных дасягненняў, прыродных рэсурсаў, рынкавых механізмаў, інфармацыйных тэхналогій. Яна ставіць перад Рэспублікай Беларусь і іншымі краінамі постсавецкай прасторы праблему, звязаную з павелічэннем разрыву паміж нацыянальнымі інтарэсамі і патрабаваннямі глабальнага рынку. Рызыка ўцягвання Беларусі ў глабальны сусвет пагражае «інтэграваннем» у сістэму глабальнай эканомікі ў якасці аднаго з элементаў «глабальнай перыферыі». Насцярожваюць і тыя абставіны, што нацыянальна-цывілізацыйная ідэнтычнасць беларускага соцыуму да сённяшніх дзён аказалася размытай. Прычыны, як сведчыць гістарычнае мінулае беларускага народа, не толькі ў «распадзе сувязі часоў», а таксама ў тым, што разам са знікненем СССР была страчана і савецкая ідэнтычнасць. У сучаснай Беларусі, як і ў большасці постсавецкіх краін, новая нацыянальна-культурная ідэнтычнасць сёння яшчэ не з'яўляецца фенаменалагічнай цэласнасцю, а хутчэй уяўляе сабой эклектычнае спалучэнне асобных савецкіх, ліберальных, рэлігійных і нават нацыяналістычных міфалагем. Тым не менш яна ўсё

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

больш дэманструе прыверžанасць сваім этнакультурным караням, духоўным імператывам і не імкнецца з лёгкасцю адмовіцца ад іх на карысць абстрактных «агульначалавечых каштоўнасцей» глабальнага свету. Рызыка можа быць значна паменшана і пры ўмове хуткага тэхніка-тэхналагічнага развіцця краіны. Таму, як нам бачыцца, у цесным і раўнапраўным саюзе (эканамічным, палітычным, навуковым, ваенным і інш.), абапіраючыся на свае духоўныя імператывы і культурныя каштоўнасці, Рэспубліка Беларусь разам з братнімі краінамі постсавецкай прасторы зможа даць належны адказ на знешнія выклікі як аўтарытэтны суб'ект глабальнай палітыкі.

1. *Кастельс, М.* Становление общества сетевых структур // Новая постиндустриальная волна на Западе. Антология / под ред. В. Л. Иноземцева / М. Кастельс. – М. : Academia, 1999. – 631 с.

2. *Малиновский, А.С.* Культурная глобализация (глокализация). Локальное и транснациональное // Вестник Томского государственного педагогического университета. – 2013. – № 1. – С. 176–179.

3. *Шваб, К.* Четвертая промышленная революция / К. Шваб. – М. : Эксмо, 2016. – 278 с.

4. *Хантингтон, С.* Кто мы? Вызовы американской национальной идентичности / С. Хантингтон. – М. : АСТ, 2008. – 603 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ИНФОРМАЦИОННО-КОММУНИКАЦИОННЫЕ ТЕХНОЛОГИИ В БИБЛИОТЕКАХ: СОСТОЯНИЕ И ПЕРСПЕКТИВЫ РАЗВИТИЯ

***Н. Ю. Березкина,*** *кандидат исторических наук, доцент, доцент кафедры культурологии и психолого-педагогических дисциплин Института повышения квалификации и переподготовки кадров Белорусского государственного университета культуры и искусств, заслуженный деятель культуры Республики Беларусь*

Одно из основных инновационных направлений повышения эффективности информационного обслуживания пользователей библиотек, – внедрение новых информационно-коммуникационных технологий (ИКТ), использова-